# ВОСЕНЬСКІ ДЗЕНЬ ГОД КОРМІЦЬ

Гэта прыказка надзвычай актуальная сёння, калі прадпрыемствы і калгасныя гаспадаркі клапоцяцца пра тое, каб належным чынам запасціся садавінай і гароднінай на зіму. Тым больш, калі ёсць чым запасацца. Да прыкладу, яблыкамі – толькі бяры ды збірай. Але ж ці так проста сабраць некалькі тон яблыкаў? Вось і просіць ужо некалькі год Талачынскі кансервавы завод дапамогі ў нашага ўніверсітэта. А машэраўцы рады старацца. Вядома, збор яблыкаў – гэта магчымасць не толькі вырвацца па-за межы горада, весела правесці час, бліжэй пазнаёміцца, але і зарабіць грошы. Таму нічога дзіўнага, што студэнты адпраўляюцца на сельскагаспадарчыя работы не пад прымусам, а самі выказваюць жаданне збіраць яблыкі ці перабіраць бульбу.

«Сёлета ПА ГА "БРСМ" ВДУ імя П.М. Машэрава з правамі раённага камітэта ўлетку накіравала ў Талачын атрад у складзе трыццаці чалавек на чале са студэнтам 5 курса ФлФ Сяргеем Заведзеевым, – расказвае выконваючы абавязкі першага сакратара Марыя Лустава. – Восенню было сфарміравана 13 сельскагаспадарчых атрадаў агульнай колькасцю 350 чалавек, якія на пачатку верасня прыступілі да працы. 15 кастрычніка апошнія студэнты вяртаюцца ў горад. Наогул, кіраўніцтва кансервавага завода задаволена працай машэраўцаў. Неаднаразова на адрас нашага ўніверсітэта прыходзілі пісьмы з падзякай».

У Талачыне для нашых хлопцаў і дзяўчат былі створаны ўсе ўмовы для прадукцыйнай працы і паўнацэннага адпачынку. Адна палова студэнтаў пражывала на базе спартыўнага летніка «Ніва», другая – у інтэрнаце гасцінічнага тыпу. Да таго ж пражыванне было поўнасцю бясплатным. Харчаваліся студэнты тры разы на дзень.









У вольны час моладзь знаходзіла занятак па душы: машэраўцы займаліся спортам, бавілі час на прыродзе, арганізоўвалі канцэрты, праводзілі спартыўныя спаборніцтвы. Прыдумалі нават жартаўлівае свята «Пасвячэнне ў калгаснікі».

«Усе нашы студэнты папрацавалі добра. Асабліва хацелася б адзначыць хлопцаў чацвёртага курса ФФКіС: Ігара Марозава, Паўла Распорскага і Рамана Фёдарава, якія выконвалі цяжкую працу. Яны ссыпалі бульбу ў мяхі і грузілі іх у фуры, – зазначае старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту А.А. Аляксеенка. – Прыемна, што і кіраўніцтва прадпрыемства паклапацілася пра студэнтаў: ім выдалі цёплае адзенне, абутак, дажджавікі».

За час працы ў калгасе хлопцы і дзяўчаты сабралі неблагі ўраджай садавіны. Адна частка ўраджаю пойдзе на перапрацоўку, другая – на продаж, каб узімку ўсе змаглі паласавацца смачнымі яблыкамі з талачынскага саду.

Сапраўды, восенькі дзень год корміць. І ў гэтым нашы студэнты ўпэўніваюцца ўжо не першы год.

**Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**

**На здымках:** *(уверсе злева направа)* студэнты 2 курса ФФКіС Уладзімір Ліфанаў і Мікалай Рапінскі, выконваючы абавязкі першага сакратара ПА ГА «БРСМ» ВДУ імя П.М. Машэрава Марыя Лустава і старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту А.А. Аляксеенка; *(унізе злева направа)* студэнт 2 курса ФФКіС Андрэй Сушчэвіч, намеснік дэкана ФСПіП па выхаваўчай рабоце Н.Я. Марціновіч са студэнтамі.

**Фота Настассі ЛАЗЕБНАЙ.**